

## Змест

**Раздзел I,**
у якім наш герой выпраўляецца
ў падарожжа .... **5**

**Раздзел II,**
у якім лялечны хлопчык знаёміцца з іншымі
цацкамі, а мы даведваемся, што прыгажосць
і добрае сэрца не заўсёды ідуць у пары .... **17**

**Раздзел III,**
які пачынаецца слязьмі,
але заканчваецца ўсмешкай .... **29**

**Раздзел IV,**
у якім шчасце мае белыя сцены
і блакітныя аканіцы .... **43**

**Раздзел V,**
у якім лялечны хлопчык вяртаецца
ў кветкавую краму .... **61**

**Раздзел VI,**
у якім на стале чакае дадатковая талерка .... **79**

**Раздзел VII,**
у якім з'яўляецца Шчасцік .... **88**

## *Раздзел I,*
## *у якім наш герой выпраўляецца ў падарожжа*




У адным мястэчку, у кветкавай краме «Фларыян і Ружа», жыў маленькі лялечны хлопчык. У яго быў драўляны тварык з круглымі вясёлымі вачыма, румяныя шчокі і каляровае адзенне, пашытае з лапікаў тканіны, а на галаве — чырвоная шапачка з чатырохлістай канюшынай. Увесь дзень ён сядзеў, абапёршыся на касу. Прадавец казаў «Дзякуй!» і «Прыходзьце яшчэ», а каса то званіла, то трашчала.

Ля ног цацкі стаяла місачка, напоўненая цукеркамі ў ружовых і зялёных паперках. Ружовыя былі клубнічныя, а зялёныя — мятна-шакаладныя. Кожны пакупнік мог пачаставацца,

а хто гэтыя цукеркі хоць раз пакаштаваў, пазней вельмі хацеў вярнуцца ў краму. Самымі ласымі на іх былі дзеці, якія засяроджана выбіралі смак. Заўважаючы ляльку, яны казалі:

— Мама, тата, які прыгожанькі хлопчык! Купіце мне?

Але пан Фларыян паказваў тады на прымацаваную паперку з надпісам «Аздоба» і казаў:

— Гэта мой маленькі памочнік! Ён тут патрэбны. Бачыш чатырохлістую канюшыну на шапачцы? Цацка прыносіць мне шчасце! Не прадаецца.

— Шкада! — адказвалі малыя.

А лялечны хлопчык праводзіў іх тужлівым позіркам да дзвярэй і думаў: «Эх, чаму дзеці прыходзяць сюды так рэдка?»

Бо праўда была ў тым, што хлопчык нічога не хацеў так моцна, як пайсці з імі. Ён жыў у кветкавай краме ўжо шмат гадоў, і, хоць любіў і кветкі, і пана Фларыяна, тут яму ап-



рыкрала. Даўней, калі ў краме яшчэ працавала пані Ружа, было нашмат весялей. Чуліся смех, жарты, супольныя спевы. Але з таго часу як прадавец застаўся сам-адзін, ён больш не напяваў пад нос. Нават радыё рэдка ўключаў. Хадзіў згорблены і задуменны, даставаў з шуфляды старыя здымкі і падоўгу іх разглядаў. А калі заканчваў працу, у краме рабілася зусім ціха і пуста. Адзіную пацеху хлопчык

тады знаходзіў у тым, каб глядзець у акно і назіраць, што адбываецца на вуліцы. Там заўсёды было цікава! Вуркаталі машыны, ездзілі ровары, летам дзеці праляталі, як вецер, на самакатах, а зімой цягнулі за сабой санкі.

Але самым цікавым падаваўся каляровы будынак на другім баку вуліцы. Гэта была крама цацак. Туды заўсёды прыходзіла шмат дзяцей: з бацькамі, з дзядулямі і бабулямі. Як шкада, што ён не жыў там! Хлопчык часта ўяўляў, як сядзіць на паліцы ў той краме і нейкае дзіця выбірае сярод усіх іншых цацак менавіта яго. Але мінаў год за годам, і нічога не змянялася. Толькі колеры на адзенні цацкі рабіліся ўсё больш бляклымі,





а валасы на галаве прадаўца — усё радзейшымі.

Пра тое, што пачаўся снежань, хлопчык даведаўся з календара на сцяне і з назіранняў за светам праз акно. У вітрынах суседніх крам з'явіліся першыя святочныя аздобы, але ў пана Фларыяна зноў нічога асаблівага не адбывалася. Ён нават не ўключыў кружэлку з калляднымі песнямі, якую раней так ахвотна слухалі ўсе разам. Хлопчык з настальгіяй згадваў пра перадкалядны час з паняй Ружай і пра тое, як цудоўна пахлі спечаныя ёю пернічкі, якія гэтай парою прыходзілі на змену цукеркам у місачцы. Ці пра тое, як яна весела спрачалася з панам Фларыянам, хто зрабіў лепшыя аздобы з галінак елкі, сасны ці вастраліста. І як прыгожа іскрыўся вечарамі снег на падаконніку, калі ў акне віселі шнуры каляровых лямпачак, а дзеці спыняліся, захоплена ўзіраючыся ў мігатлівыя агеньчыкі...

Выглядала на тое, што хлопчыку і сёлета давядзецца задаволіцца ўспамінамі і назіраннем за вуліцай праз шыбу. Ды атрымалася зусім іначай! Аднойчы кветкавую краму зачынілі. Прыйшлі нейкія людзі ў блакітных камбінезонах і пачалі ўсё перастаўляць. Выносілі адны рэчы, а заносілі іншыя, свідравалі, грукаталі, фарбавалі. Хтосьці прыбраў на прылаўку, склаў усё ў кардонную скрынку і паставіў яе ля адчыненых дзвярэй. Хлопчык адчуў на твары павеў халоднага ветру. Гэта быў шанц! Хлопчык палічыў у думках да трох, а потым з усяе моцы адштурхнуўся і скочыў. Прабег некалькі крокаў, прысеў на кукішкі і схаваўся пад нейкімі сходамі. Ніхто нічога не заўважыў.

На дварэ было шэра і мокра. Машыны сігналілі, а людзі хадзілі хуткім крокам, нібы хацелі як найхутчэй уцячы ад брыдкага надвор’я. «Мне трэба хуценька трапіць у краму цацак! — падумаў хлопчык. — Сяду на якой-небудзь



паліцы. Нейкае дзіця абавязкова мяне заўважыць і забярэ з сабой».

Трапіць туды — гэта лёгка сказаць. Але як? Праз акно вуліца падавалася куды менш грознай, чым цяпер. Хлопчык уздыхнуў, паглядзеў уверх і прашаптаў:

— Каб жа ў мяне былі крылы...

— Але ці меў бы ты адвагу паляцець? — азваўся нехта за ягонай спінай.

Хлопчык азірнуўся і ўбачыў голуба, які часта хадзіў пад вокнамі крамы ў пошуках ежы. Хлопчык не заўважыў яго раней, бо пер’е ў птушкі было колеру кавы з малаком, якую